6. Программа воспитания и защиты прав и законных интересов детей, находящихся в социально опасном положении: Утв. Приказом Министерства образования Республики Беларусь от 24.05.2011 №336 // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2016.
7. Дом без насилия - [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mvd.gov.by/ main.aspx?guid=323473.- Дата доступа 21.06.2016

**УДК 343.213.5**

## АБ’ЕКТЫЎНАЯ НЕАБАРАЧАЛЬНАСЦЬ ЧАСУ І КРЫМІНАЛЬНЫ ЗАКОН

*А. М. Сяргейчык,*
*Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь*

Разгляд пытанняў функцыянавання крымінальнага закона ў часе мае перадумовай, перш за ўсё, неабходнасць ўразумення сутнасці паняцця *час* і характару яго накіраванасці ў адносінах да *мінулага* і *будучыні*.

На сённяшні дзень няма адзінага, агульнапрынятага падыходу да вызначэння паняцця *час*. Тым не менш, адносна яго уласцівасцяў нейкія агульныя падыходы прасачыць можна.

У «Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы» прыведзены наступныя вызначэнні: «адна з асноўных аб’ектыўных форм (поруч з прасторай) існавання матэрыі; бесперапынная і пастаянная змена мінут, гадзін, дзён і пад.; прамежак пэўнай працягласці, у які адбываецца што-небудзь, *паслядоўная* (вылучана намі – А. С.) змена гадзін, дзён, гадоў і пад.» [1, с. 744].

У «Філасофскім слоўніку» пад рэдакцыяй І. Т. Фралова дадзена наступнае вызначэнне часу і яго асноўных уласцівасцяў: «Праява быцця з пункту гледжання мінулага, сучаснасці, будучыні і адносін «раней», «адначасова», «пазней», што на іх базуюцца; паняцце часу адлюстроўвае працягласць і паслядоўнасць падзей. Час непарыўна звязаны са змяненнем. Без змянення, г. зн. без працэсаў, няма часу. Але час не тоесны змяненню і таму, што змяняецца. Ён адносна незалежны ад іх у тым сэнсе, што час абыякавы да таго, што менавіта змяняецца» [2, с. 103]. І далей: «Час (адлюстроўвае) паслядоўнасць існавання змяняючых адна адну з'яў. Час неабарачальны, г. зн. усякі матэрыяльны працэс развіваецца ў адным кірунку – ад *мінулага* да *будучыні* (вылучана намі – А. С.) » [2, с. 104].

Безумоўна, у кантэксце тэмпаральнага функцыянавання крымінальнага закона не мае сэнсу падрабязна спыняцца на праблемах разумення часу ў прыродазнаўчым і сацыяльным сэнсе, праблемах яго інтэнсіўнасці, дынамікі і. г. д.

Адзіным, але, мабыць, галоўным пытаннем, звязаным з паняццем часу, якое ўяўляе цікавасць у дадзеным кантэксце, з'яўляецца пытанне аб яго *абарачальнасці*, г. зн. пытанне аб накіраванасці яго дзеяння ў рамках паняццяў *мінулае*, *сучаснасць* і *будучыня*.

З прыведзеных вышэй вызначэнняў час характарызуе эвалюцыю (развіццё) з'яў, накіраваную з *мінулага* ў *будучыню*. Г. зн. ён *аднанакіраваны* (строга з *мінулага* ў *будучыню*), але *аднанакіраваны* не ў прасторавым сэнсе, а ў сэнсе развіцця пэўных працэсаў, якія выступаюць індыкатарамі прынцыповага адрознення *мінулага* і *будучыні*.

Так, абгрунтоўваючы накіраванасць часу строга з мінулага ў будучыню С. У. Хокінг называе тры стралы часу: 1) тэрмадынамічную, заснаваную на другім законе тэрмадынамікі, які пастулюе ўзрастанне энтрапіі ў будучыні для ізаляваных сістэм; 2) псіхалагічную – людзі памятаюць мінулае, а не будучыню, такім чынам, мінулае *папярэднічае* будучыні ў часе; 3) касмалагічную – Сусвет пашыраецца ў кірунку з мінулага ў будучыню [3, с. 87].

З усіх раздзелаў фізікі толькі класічная механіка і электрадынаміка дапускаюць абарачальнасць часу, але выключна ў матэматычным сэнсе [4, с. 109].

Абарачальнасць часу супярэчыць фізічнаму прынцыпу прычыннасці, які забараняе ўплыў канкрэтнай падзеі на ўсе падзеі, якія ёй папярэднічалі. Іншымі словамі, падзея-прычына папярэднічае ў часе падзеі-выніку, будучыня не можа ўплываць на мінулае [5, с. 119–121].

Прычыннасць у філасофскім сэнсе таксама выводзіцца з ўзаемнай абумоўленасці, дэтэрмініраванасці паслядоўнасці падзей. Уплыў падзеі не толькі на будучыню, але і на мінулае прывёў бы да ўтварэння замкнёных цыклаў прычынна-выніковай сувязі, аж да знішчэння самой прычыны і разрыву такой сувязі [2, с. 463–464].

Варта падкрэсліць, што, пачынаючы з 60-х гг. XX стагоддзя, у навуковай супольнасці вядзецца ажыўленая дыскусія па пытанні аб слушнасці прынцыпу прычыннасці ў яго класічным разуменні для элементарных часціц, якія рухаюцца з хуткасцю, блізкай да хуткасці святла, але паколькі юрыспрудэнцыя мае справу з грамадскімі адносінамі, г. зн. з пэўнай формай ўзаемадзеяння людзей, якія, безумоўна, адносяцца да аб'ектаў макрасвету, хуткасць руху якіх у параўнанні з хуткасцю святла нікчэмна малая, на дадзеную дыскусію ў нашым выпадку можна

не звяртаць увагі і пагадзіцца з эмпірычнай неабвяргальнасцю разглядананага прынцыпу.

Такім чынам, час неабарачальны і мае накіраванасць з мінулага ў будучыню. Адсюль вынікае, што і ўсе працэсы, якія праходзяць у прыродзе і ў грамадскім жыцці тэмпаральна неабарачальныя.

У дачыненні да разгляданага намі пытання гэта азначае наступнае: крымінальны закон (як і любы іншы закон) дзейнічае і прымяняецца толькі на будучы час.

Абарачальнасць закона ў часе аб'ектыўна немагчымая, бо прадугледжвала б абарачальнасць самога часу, што, як ужо было адзначана, супярэчыла б прынцыпу прычыннасці.

**Літаратура:**

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / рэдкал.: М.Р. Суднік [і інш.]. – 3-е выд. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2002. – 784 с.

2. Философский словарь/ И. Т. Фролов [и др.]; под ред. И.Т. Фролова. – 7-е изд., перераб. и доп. – М.: Республика, 2001. – 719 с.

3. Хокинг, С. У. Краткая история времени: от большого взрыва до черных дыр [Электронный ресурс] / С.У. Хокинг. – 110 с. – Режим доступа: http://znaniya-sila.narod.ru/library/pdf_00/hawk_th.pdf. – Дата доступа: 28.06.2016.

4. Бриллюэн, Л. Научная неопределенность и информация / Л. Бриллюэн. – М.: Мир, 1966. –271 с.

5. Физическая энциклопедия: в 5 т. / редкол.: А. М. Прохоров (гл. ред.) [и др.]. – М.: «Большая Российская энциклопедия», 1988–1999. – Т. 4. – 1995. – 701 с.

**УДК 343.7**

## УГОЛОВНО-ПРАВОВАЯ ОХРАНА ГРАЖДАНСКОГО ОБОРОТА: ПОСТАНОВКА ПРОБЛЕМЫ

*В.В. Хилюта,*
*кандидат юридических наук, доцент*
*Гродненский государственный университет им. Я.Купалы*

В настоящее время многие преступные деяния совершаются в сфере гражданского оборота, где существуют самые разнообразные имущественные отношения. В этой связи специфика процессов экономического развития общества и государства определяет систему мер противодействия со стороны государства противоправным деяниям в сфере оборота экономических благ посредством криминализации незаконных деяний в данной области.